# Масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК “Лунінецкая РЦБС” у чэрвені

У бібліятэках Лунінецкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы адбыліся мерапрыемствы, прысвечаныя **Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.**

**3 ліпеня. ЦБ. ЦДБ.** Бібліятэкі прынялі ўдзел у святочнай праграме, прысвечанай Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. На бібліятэчнай пляцоўцы былі аформлены кніжныя выставы «Край мой Белая Русь», «Беларусь мая сінявокая», дзе прадстаўлены выданні, якія адлюстроўваюць багатую гісторыю, культуру і традыцыі беларускага народа.

На пляцоўцы каля помніка Якубу Коласу адбылася літаратурна-музычная кампазіцыя «Квітней, Радзіма, пад блакітным небам» з удзелам народнай літаратурна-паэтычнай студыі «Літаратурная правінцыя». Удзельнікі чыталі вершы і спявалі песні пра Беларусь. У рамках мерапрыемства прайшла цырымонія ўзнагароджання нашага земляка пераможцы XI міжнародных Васільеўскіх чытанняў у г.Солнечнагорск Яўгена Рафаловіча.

**3 ліпеня. Мікашэвіцкая г.б.** Супроцоўнікі бібліятэкі арганізавалі інтэрактыўна-гульнявую пляцоўку «Славім імя Тваё, Беларусь». Кожны жадаючы мог праверыць свае веды па гісторыі горада, адказаўшы на пытанні краязнаўчай віктарыны і прыняўшы ўдзел у акцыі «Добрыя пажаданні роднаму гораду».

Прайшлі мерапрыемствы ў сельскіх бібліятэках. Так**, 2 ліпеня** ў **Бродніцкай** сельскай бібліятэцы-клубе прайшла тэст-гульня «Интересные факты о Беларуси», у **Бастынскай с.б**. – інфармацыйная гадзіна «Квітней пад сонцам, Беларусь», у **Рэдзігераўскай с.б.** – патрыятычная гадзіна «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся», у **Кажан-Гарадоцкай** сельскай бібліятэцы-клубе прайшла патрыятычная акцыя «Квітней пад сонцам, Беларусь» і інш.

**12 ліпеня. ЦБ і ЦДБ.** Супрацоўнікі бібліятэк прынялі ўдзел у святкаванні Дня горада. Была падрыхтавана адкрытая пляцоўка «С днём рождения, любимый город!». Жыхары горада знаёміліся з матэрыяламі краязнаўчых кніжных выстаў «Лунінец: учора, сёння, заўтра», «Лунінеччына літаратурная», інфармацыйнай выставай «Бренды Лунинетчины», фотавыставай «Імі ганарыцца Лунінец”, інфармацыйнымі стэндамі «Библиотечные истории в фотографиях». Таксама працавала выстава творчых работ «Чудеса своими руками» і фотазона «Я люблю Лунинец».

На бібліятэчнай пляцоўцы адбылася літаратурна-музычная кампазіцыя «Любимый сердцем город» з удзелам народнай літаратурна-паэтычнай студыі «Литературная провинция».

Для юных чытачоў працавала літаратурна-гульнявая пляцоўка «Город детства».

**23 ліпеня. ЦБ**. Адбылася творчая вечарына ўдзельніцы народнай літаратурна-паэтычнай студыі «Литературная провинция» Галіны Брэзінай «Стихи – моя судьба». Галіна Уладзіміраўна – пісьменніца, выканаўца народных і аўтарскіх песень, майстар дэкаратыўна-прыкладной творчасці, вядомая далёка за

межамі Лунінеччыны. Актыўна ўдзельнічае ў розных конкурсах, фестывалях і выставах.
**24 ліпеня. ЦБ.** Адбылася сустрэча з настаяцелем храма Святой Жываначальнай Тройцы (в.Вічын), іерэем Васілём Мартынавым. Тэма гутаркі «Храм - як Божы Дом і важнасць духоўнага развіцця чалавека». Айцец Васіль цікава і даступна распавёў прысутным пра значэнне веры ў духоўным і свецкім жыцці, пра ролю сям'і ў жыцці кожнага чалавека. Святар звярнуў увагу прысутных на тое, што любая сям'я павінна пачынацца з любові і ўзаемаразумення.

Летнія канікулы працягваюцца, а разам з імі у самым разгары ў бібліятэках мерапрыемствы праграмы летняга чытання «Лета ў кніжнай кампаніі».

**Мікашэвіцкая г.б.** 11 ліпеня прайшла літаратурная віктарына па экалогіі «Природа учит и воспитывает», 16 ліпеня правялі літаратурную вандроўку «По страницам сказок», 23 ліпеня адбылася інтэлектуальная гульня «Всё обо всём», 30 ліпеня прайшла конкурсна-забаўляльная праграма «Что дороже золота?».

**ЦДБ.** 17 ліпеня адбылася інфапазнайка «Раз, два, три, четыре, пять – летом некогда скучать». 24 ліпеня для выхаванцаў дзіцячага садка №3 правялі гульнявую праграму «Вместе весело шагать…», прысвечаную Міжнароднаму дню сяброўства.

**28 ліпеня. Мікашевічская г.б.** У рамках праграмы духоўна-маральнага выхавання «По пути к добру и свету» адбылася гутарка «Книги для души». На мерапрыемстве прысутнічалі выхаванцы нядзельных школ.

**29 ліпеня. ЦБ.** У чытальнай зале бібліятэкі супрацоўнікі бібліятэкі правялі гадзіну прававых ведаў для падлеткаў «Права свои знай, обязанности не забывай». На мерапрыемства запрасілі інспектара ІСН Каржаневіча Руслана Юр’евіча.

**31 ліпеня. ЦБ.** Адбылася сустрэча калектыву цэнтральнай раённай бібліятэкі з адвакатам юрыдычнай кансультацыі Лунінецкага раёна Тамарай Аляксееўнай Грыцкевіч на тэму «Беларусь суверенная от восстановления народного хозяйства к инновационным проектам будущего».